Радыё “Свабода”
01.10.2019

# Беларускія часопісы міжваеннага часу цяпер можна пачытаць онлайн

---



Ілюстрацыйнае фота

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі выклала ў публічны онлайн-доступ калекцыю беларускіх часопісаў 1919–1945 гадоў.**

Матэрыялы ў калекцыі ў залежнасьці ад месца выданьня дзеляцца на тры разьдзелы:

- Часопісы БССР;
- Часопісы Заходняй Беларусі;
- Часопісы беларускага замежжа.

У калекцыю ўключылі ня толькі выданьні, якія выходзілі з пэўнай пэрыядычнасьцю, але і тыя, што выдаваліся аднаразова або нерэгулярна. Большасьць з прадстаўленых часопісаў прысьвечана літаратурнай і літаратуразнаўчай тэматыцы цалкам, у астатніх выданьнях падобны кантэнт прысутнічае часткова.

Анансавалі, што калекцыя будзе дапаўняцца.